Манюшко Полина Юрьевна

У еднасці сіла

У чым наша сіла? У мужнасці хлопцаў?
У дзявочай ласкавасці і дабрыні?
Ці ў велічы дуба, магутнасці соснаў?
У крыллі буслоў, што ляцяць у вышыні?

У еднасці сіла! У адзінстве народа:
Дарослых, падлеткаў, дзяцей, пажылых.
Якія ў крамах, бальніцах, заводах,
Працуюць для росквіту месцаў святых.

Традыцыі продкаў, культуру шануюць.
Гісторыю помняць, яе берагуць.
І шчыра сябруюць, і сілы гартуюць,
І горда свой сцяг над краінай нясуць!

У кожнага з нас розны лёс і дарога,
Але мы звязаны адным назаўжды:
Любоўю да роднага сада, парога,
Якая не згасне ў ліхія гады.

І сіла ў людзях: у еднасці думак,
Намераў, паступкаў, сумлення і мар.
У тым, які выбраў сабе накірунак
І як ты жыццёвы трымаеш удар.

Усе беларусы адзіны жаданнем,
Каб наша краіна жыла і цвіла!
Каб дзесьці салоўка спяваў на світанні,
Рачулка шумела і пчолка гула.

Каб мірнае неба, спакой быў і шчасце,
Каб дзеці раслі, і здаровы бацькі…
Няхай абмінуць нас любыя напасці,
Пакуль мы адзіны на роднай зямлі!